# ДАВЕДНІК ДЛЯ ІНШАЗЕМЦАЎ

## *Польскі рынак працы патрабуе работнікаў*

### *Іншаземец, які працуе ў Польшчы, абавязаны:*

- **мець дакумент, які дапускае яго да польскага рынку працы:**
  - ✓ дазвол на працу ці
  - ✓ дазвол на сезонную працу ці
  - ✓ заяву аб даручэнні выконвання працы іншаземцу альбо
  - ✓ дазвол на часовае знаходжанне і працу

  альбо быць звольнены ад гэтага патрабавання,
- **мець дакумент, які легалізуе яго побыт,** напрыклад адпаведную візу ці дазвол на знаходжанне;
- **заключыць** з наймальнікам **дагавор** звязаны з працай;
- выконваць працу выключна для наймальніка, указанага ў дазволе альбо заяве, на ўмовах, прадугледжаных гэтым дакументам.

### *Дакументы, якія прадастаўляюць доступ да польскага рынку працы, аб якіх можа хадайнічаць наймальнік:*

| Дакументы, якія прадастаўляюць доступ да польскага рынку працы, аб якіх можа хадайнічаць наймальнік: | Прызначаны для | Выдадзены | Галіны эканомікі | Установлены заканадаўствам час на выдачу для спраў, якія не патрабуюць высвятленняў | Працягласць працаўладкаван ня |
|---|---|---|---|---|---|
| Дазвол на працу (тып: A, B, C, D, E) | **усе іншаземцы** з трэціх краін (па-за ЕС/ ЕЭП і Швейцарыі) | **Ваяводскае** упраўленне | **усе** секцыі ПКД **акрамя сезонных** | да **30 дзён** | да **3 гадоў** (выключэнні да 5 гадоў) |
| Дазвол на сезонную працу | **усе іншаземцы** з трэціх краін (па-за ЕС/ ЕЭП і Швейцарыі) | **Павятовае** бюро працы | **сезонные** работы (у асноўным сельская гаспадарка і часткова турызм) | да **7 дзён** | да **9 месяцаў** у календарным годзе |
| Заява аб даручэнні выконвання працы іншаземцу | **грамадзяне краін:** Украіны, Беларусі, Грузіі, Малдовы, і Арменіі | **Павятовае** бюро працы | **усе** секцыі ПКД **акрамя сезонных** | да **7 дзён** | да **24 месяцаў** |

European Funds
Digital Poland

Republic of Poland

European Union
European Regional Development Fund

# Правілы выконвання працы іншаземцам ў Польшцы на легальнай аснове:

- **Аб выдачы** для дадзенага іншаземца **дазвола** на працу альбо дазвола на сезонную працу **альбо аб рэгістрацыі** заявы аб даручэнні выконвання працы ў рэестры заяваў **звяртаецца да ўпраўлення наймальнік.**

  Некаторыя іншаземцы могуць працаваць у Пльшчы без неабходнасці мець дазвол на працу альбо заяву аб даручэнні выконвання працы. Гэта магчыма ў выпадку: грамадзян ЕС/ЕЭП і Швейцарыі, іншаземцаў, якія маюць Карту Паляка, дазвол на сталае пражыванне альбо статус доўгатэрміновага рэзідэнта ЕС. Гэта таксама датычыць іншаземцаў, якім быў выдадзены дазвол на часовае знаходжанне, у тым ліку ў сувязі з заключэннем шлюбу з польскім грамадзянінам ці з мэтай правядзення навуковых даследаванняў. Таксама грамадзяне Украіны, якія прыбылі ў Польшчу пасля 24 лютага 2022 года і ўсе ўкраінцы, якія легальна пражываюць у Польшчы можа працаваць у любога працадаўцы ў Польшчы без дадатковых дазволаў, на падставе паведамлення аб даручэнні грамадзяніна Украіны на працу.

- Выдадзены ўпраўленнем **дазвол або** зарэгістраваную **заяву наймальнік павінен перадаць іншаземцу.**

  Кожны дазвол і заява аб даручэнні выконвання працы іншаземцу вызначае ўмовы працы ў Польшчы, менавіта: від дагавора, пасада, памер часу працы альбо колькасць гадзін працы ў тыдзень ці ў месяц, а таксама мінімальную заработную плату, якую павінен атрымаць іншаземец, які працуе на дадзенай пасадзе.

- **Наймальнік абавязаны заключыць** з іншаземцам **дагавор у пісьмовай форме**, а дадаткова прадаставіць пераклад дагавора на мову, зразумелую для іншаземца.

  **Від дагавора** паміж іншаземцам і наймальнікам павінен быць **дапасаваны да характару працы.** Найбольш правоў гарантуе іншаземцу "працоўны дагавор". Акрамя таго заключаюцца грамадзянскаправавыя дагаворы, напрыклад "дагавор платнага аказання паслуг", а ў выпадку сезонных работ - "дагавор аб дапамозе пры уборцы ураджаю".

- Іншаземец абавязаны прадаставіць наймальніку дакумент, які легалізуе яго побыт, для скапіравання і захавання для патрабаванняў кантроля.



**У 2022 г. выдадзена каля:**

- ✓ **365,5 тыс. дазволаў на працу,**
- ✓ **25 тыс. дазволаў на сезонную працу,**
- ✓ **1,38 млн заяваў аб даручэнні выконвання працы іншаземцам,**
- ✓ **786 тыс. паведамлення аб даручэнні працы грамадзяніну Украіны.**

## Іншыя магчымасці легалізацыі побыту і працы ў Польшчы

Іншаземец, які на легальнай аснове знаходзіцца ў Польшчы, можа звярнуцца аб выданні дазвола на часовае знаходжанне і працу, т. зв. адзіны дазвол, да адпаведнага ваяводы. Падрабязную інфармацыю на гэту тэму можна знайсьці тут: https://www.gov.pl/web/udsc.

## Перавагі легальнага працаўладкавання ў Польшчы для

- **Іншаземец падлягае ахове, гарантаванай Працоўным кодэксам.**

  У прыватнасці, ён мае права:

  - ✓ атрымоўваць масячную заработную плату ў поўным памеры часу працы, г. зн.: 160 гадзін ў месяц, у памеры мін. 3.600 зл брута, а ў выпадку пагадзіннай стаўкі– 23,50 зл брута за 1 гадзіну працы,,
  - ✓ на дадатковую заработную плату за звышурочныя, за працу ў начныя гадзіны альбо ў дні вольныя ад працы (у нядзелі і святочныя дні),
  - ✓ на платны водпуск для адпачынку і на заработную плату на час хваробы,
  - ✓ на абарону ад скасавання працоўнага дагавора наймальнікам, калі работнік знаходзіцца на бальнічным, знаходзіцца ў водпуску, у выпадку работніка пенсійнага ўзросту альбо цяжарнага работніка.





- **Ён падлягае сацыяльнаму і медыцынскаму страхаванню** - аб'ём вар'іруецца ў залежнасці ад дагавора.

- **Ён можа карыстацца бясплатным медыцынскім абслугоўваннем -** у дзяржаўных бальніцах ці паліклініках.

- **Ён мае права зарэгістравацца** ў павятовым бюро працы **ў якасці беспрацоўнага альбо асобы, якая шукае працу** - калі ён страціць працу ў Польшчы і мае адну з устаноўленых падставаў для побыту.

- У выпадку парушэнняў пры працаўладкаванні ён можа скарыстацца дапамогай:

  - ✓ Дзяржаўнай інспекцыі працы,
  - ✓ Дзяржаўнай санітарнай інспекцыі,
  - ✓ Інфармацыйна-кансультацыйнага цэнтра па пытаннях занятасці "Зялёная лінія",
  - ✓ пасольстваў і консульстваў

  альбо перадаць справу ў працоўны суд.

Больш падрабязную інфармацыю на гэтую тэму можна знайсці на сайце: https://pip.gov.pl, https://psz.praca.gov.pl, https://www.gov.pl/web/gis, https://zielonalinia.gov.pl/.

## Дзе іншаземец можа знайсці інфармацыю аб працы ў Польшчы:

**Інфармацыя аб умовах даверэння працы замежнікам у Польшчы** даступная ў моўных версіях, якія можна змяніць у шапцы старонкі.

**Партал Польскай службы занятасці (PSZ) — psz.praca.gov.pl**

Прысвечаныя іншаземцам **прапановы працы** ў Польшчы і мерапрыемствы арганізаваныя цэнтрамі занятасці публікуюцца ў наступных моўных версіях:

- англійскай: https://oferty.praca.gov.pl/portal/en
- беларускай: https://oferty.praca.gov.pl/portal/be
- рускай: https://oferty.praca.gov.pl/portal/ru
- украінскай: https://oferty.praca.gov.pl/portal/uk

**Цэнтральная база прапаноў працы (CBOP) — oferty.praca.gov.pl**




## Парады для іншаземцаў, якія шукаюць працу ў Польшчы:

- **Не аддавайце нікому свой пашпарт або пасведчанне асобы** - ніводная служба занятасці гэтага не патрабуе.
- **Перш чым прыехаць у Польшчу, праверце наймальніка, які прапануе працу** - звяжыцеся з ім па тэлефоне, шукайце меркаванні ў Інтэрнэце. Звесткі аб наймальніках таксама можна знайсці ў:
  - ✓ базе Нацыянальнага дзяржаўнага рэестра суб'ектаў народнай гаспадаркі (REGON) - https://wyszukiwarkaregon.stat.gov.pl/appBIR/index.aspx,
  - ✓ Дзяржаўным судовым рэестры (KRS) - https://ekrs.ms.gov.pl/web/wyszukiwarka-krs/strona-glowna/index.html.


**Інфармацыя аб праекце:**

*Моўныя версіі Партала Польскай службы занятасці і Цэнтральнай базы прапаноў працы (CBOP) рэалізаваныя ў рамках праекта "Маніторынг працы і знаходжання ў зарабковых мэтах замежных грамадзян на тэрыторыі Рэспублікі Польшча" № POPC.02.01.00-00-0093/18 у рамках Аператыўнай праграмы "Лічбавая Польшча" на 2014-2020 гады, Першачарговая вось II "Электронная адміністрацыя і адкрыты ўрад", Мера 2.1 "Высокая даступнасць і якасць дзяржаўных электронных паслуг", якая рэалізуецца Міністэрствам сям'і, працы і сацыяльнай палітыкі сумесна з партнёрамі: Галоўнай камендатурай пагранічнай службы, Дзяржаўнай інспекцыяй працы, Упраўленнем па справах іншаземцаў, Упраўленнем сацыяльнага страхавання.*

CENTRALNA BAZA OFERT PRACY — oferty.praca.gov.pl

praca.gov.pl — praca.gov.pl

WORTAL PUBLICZNYCH SŁUŻB ZATRUDNIENIA — psz.praca.gov.pl

Ministerstwo Rodziny i Polityki Społecznej

PAŃSTWOWA INSPEKCJA PRACY

URZĄD DO SPRAW CUDZOZIEMCÓW

ZUS ZAKŁAD UBEZPIECZEŃ SPOŁECZNYCH